УДК 821.161.3.09

А.М. Макарэвіч (г. Магілёў, Беларусь)

"САТАНІНСКІ ТУР" ІВАНА ШАМЯКІНА: АСАБЛІВАСЦІ АДЛЮСТРАВАННЯ ГРАМАДСКІХ ПРАЯЎ РЭЧАІСНАСЦІ 1990-х гадоў

Рэчаіснасць 90-х гадоў XX ст. з яе катастрафічнымі ў грамадскіх адносінах праявамі ў Беларусі выклікала ў свядомасці І. Шамякіна, з аднаго боку, яе непрыняцце, глыбокае расчараванне з той прычыны, што грамадскія дасягненні савецкага часу перакрэсліваліся ўчынкамі і вынікамі намаганняў палітыкаў, дзеячаў культуры і літаратуры. З другога боку, такое расчараванне і непрыняцце выклікала ў пісьменніка своеасаблівы пратэст. Ён праяўляўся ў такіх формах, як публічныя выступленні з адпаведнымі ацэнкамі, мастацкія творы, у якіх аўтар катэгарычна не прымаў не толькі негатыўныя (часам трагічныя) з'явы, а і ўвогуле тыя ўмовы выжывання грамадзян у сітуацыі татальнага дэфіцыту і безграшоўя, якія нараджалі гэтыя негатыўныя з'явы.

Прыкладам таму могуць быць дённікавыя запісы пісьменніка 1992–94 гг.

Так, напрыклад, абсалютнае непрыняцце з боку І. Шамякіна выклікаюць такія грамадскія з'явы, як рост цэн і "грабеж" насельніцтва ўрадам [1, с. 362, 363, 389, 456, 457, 495, 511], адсутнасць тавараў нават першай неабходнасці [1, с. 408], немагчымасць набыць штосьці для нармальнага жыцця. З гэтымі з'явамі сутыкалася і сям'я пісьменніка [1, с. 401, 415, 431, 470], не гаворачы ўжо пра простых людзей. У той жа час чыноўнікі, якія павінны былі б дбаць пра народ, "*адкрыта, бесцырымонна*" бяруць хабар [1, с. 402]. Болей за тое, у атмасферы ўсеагульнага жабрачага становішча народа наладжваюцца шыкоўныя банкеты.

"*А ўвечары пайшоў па запрашэнню мітрапаліта Філарэта на велікодную вячэру ў епархію. Стол здаўся бедным. Але ўладыка растлумачыў, тут жа: "Сёння ў нас вечар будзе даўгі. Па запрашэнню нашага спонсара фірмы "Хелена Валеры" паедзем на вячэру*".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паехалі ў Палац піянераў. <...> Уяўляю, каб пры Машэраве камусь прыйшло ў галаву наладзіць у палацы піянераў такую п'янку – што было б! А п'янка была грандыёзная! <...>

А ўвогуле... піў я, еў, але не пакідала адчуванне: пир во время чумы [тут і далей падкрэслена тое, што ў пісьменніка вылучана курсівам. – А.М.]. *Пад вобразам распятага Хрыста. Страшна. Усё – страшна. Жыццё страшнае. І нішто не дае радасці – ніякія святы, ніякія вячэры*" [1, с. 442].

Асаблівую трывогу ў І. Шамякіна выклікае лёс будучага краіны – яе дзяцей. Адна частка гэтага будучага – тая, якой можа пагражаць голад [1, с. 390], а другая частка ("*дзеці і ўнукі сённяшніх спекулянтаў, якія скончаць Сарбону, Кембрыдж, Гарвард*") пры гэтым не падумае пра "*галодных*" [1, с. 433].

У такіх умовах І. Шамякіна не пакідае жаданне асэнсоўваць у літаратурных формах супярэчлівыя і напоўненыя драматызмам падзеі рэчаіснасці, хоць публікаваць творы было дастаткова цяжка.

"*Улезці у раман? Але ж палітыкі ў ім будзе больш, чым у любым папярэднім. А пісаць любоўную гісторыю ў час такога распаду, разлажэння – сорамна*" [1, с. 364]. "*Вось так і жыву. Божа мой! Ці думаў я, што дайду да такой галечы? Пісьменнік, творча актыўны! За паўтара года напісаў пяць аповесцей. Але надрукаваў пакуль што дзве*" [1, с. 458].

Асэнсаванне І. Шамякіным формаў і сродкаў выжывання разгубленага чалавека, з аднаго боку, і ўпэўненага ў сабе, з другога, ва ўмовах грамадскага бязладдзя прывяло ў выніку да стварэння ў 1993 годзе такіх аповесцей, як "Сатанінскі тур", "Падзенне", "Адна на падмостках".

У гэты час пісьменнік працуе ў жанры аповесці, а не рамана, хоць жаданне звярнуцца да раманнай формы адлюстравання рэчаіснасці ў яго было. "*Раман! Цягне на раман. Ці хопіць творчай патэнцыі? І хочацца і страшна*" [1, с. 402].

Чаму ўсё ж такі аповесці, а не раманы? Сам І. Шамякін дае наступныя адказы.

"*Садзіць сябе за раман баюся. Ды і харошы гэта жанр – кароткая аповесць. Дарэмна раней ігнараваў . "Зямны рай" і "Вернісаж" – у цэнтры ўвагі, пра іх гавораць больш, чым пра любы мой раман. Ёсць высокія ацэнкі*" [1, с. 441].

"*Маю пяць аповесцей. Вопыт ці жыццё прывялі да гэтага жанру – да кароткіх аповесцей <...>. І ў маладыя гады гэтулькі не выдаваў. <...>*

Пісаць зараз тоўстыя раманы нельга – не надрукуеш. Ды і цікавей рабіць такія аповесці! <...>" [1 , с. 456–457].

Сюжэты названых вышэй аповесцей 1993 года вызначаюцца сацыяльнай завостранасцю, надзённасцю, надзвычайнай трагедыйнасцю. Такія сюжэты былі новымі для тагачаснай літаратуры. Урэшце і сам пісьменнік адзначаў, што ён "*у тэмах*" "*заўсёды быў першаадкрывальнікам*" [1, с. 448].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мы нездарма звярнуліся да канстатацыі тых фактаў з грамадскага жыцця, якія непакоілі пісьменніка, выклікалі ў яго свядомасці нязгоду, пратэст, жаданне выкрыць сацыяльную хлусню, гульню, злачынства. Згаданыя вышэй дзённікавыя запісы І. Шамякіна даюць магчымасць прасачыць не толькі вытокі сюжэтаў яго аповесцей, а таксама і той грамадзянскі імпульс, які не дазваляў пісьменніку прапускаць міма ўвагі негатыўныя праявы рэчаіснасці. Многае з гэтага пераходзіла на мастацкім узроўні ў яго аповесці 1990-х гадоў.

Так, напрыклад, рэальныя факты былі пакладзены ў аснову аповесці "Сатанінскі тур". І. Шамякін наступным чынам зафіксаваў іх у дзённікавым запісе ад 11 студзеня 1993 года.

"*Учора расійскае тэлебачанне перадало дзікі факт, які проста ашаламіў.* <...>

З Пскова ішоў аўтобус з мяшэчнікамі, тарбахватамі, хапугамі ў Польшчу. На пад'ездзе да мяжы (да Брэста, Гродна?) памёр адзін з пасажыраў. Што робяць астатнія? Спыняюцца? Павяртаюць назад? Не. Гарыць бізнес. Труп нябожчыка кладуць на задняе сядзенне, накрываюць і працягваюць свой маршрут – да польскага базару. Праходзяць мытню. Пераязджаюць граніцу. Чатыры дні ездзяць па Польшчы, прадаюць, купляюць, начуюць у аўтобусе, ядзяць, п'юць – побач з нябожчыкам. Жах! Да якога падзення дайшлі людзі! <...>

Уначы пракручваў гэты сюжэт. Але жудасна рабілася, што 25–30 беларусаў мушу рабіць вось такімі... нелюдзямі. Безумоўна, нелюдзі, інакш не назавеш" [1, с. 456–457].

Як жа такія рэальныя факты адлюстраваны І. Шамякіным ужо ў мастацкай форме?

Гэты трагічны жыццёвы "сюжэт" пісьменнік амаль цалкам пераносіць у аповесць "Сатанінскі тур", напаўняючы мастацкую прастору твора адпаведнымі прычынна-выніковымі сувязямі і вывадамі (найбольш апасродкаванымі) агульначалавечага зместу.

Падзеі аповесці адбываюцца на працягу чатырох-пяці дзён. Яны разгортваюцца ў наступных падзейных плоскасцях: а) *у сувязі з падрыхтоўкай да паездкі ў Польшчу на гандаль Уладзіслава* – у кватэры Булаўскіх; б) *у сувязі з уласна паездкай* – у Віцебску на месцы збору "турыстаў", у час паездкі – у аўтобусе, на Брэсцкай мытні, на Тамашоўскім і Варшаўскім рынках у Польшчы, на Варшаўскім вакзале, па дарозе ў Брэст, каля аддзела міліцыі ў Брэсце; в) *у сувязі з пахаваннем Уладзіслава Булаўскага* – у Віцебску, каля актавай залы інстытута, дзе раней працаваў галоўны герой, а цяпер стаіць труна з яго целам у час пахавальнага развітання з ім.

Сістэма вобразаў аповесці прадстаўлена некалькімі групамі літаратурных герояў. *Рэальны план:* а) Уладзіслаў Булаўскі, яго сям'я, суседка Ларыса,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

б) удзельнікі "турыстычна"-гандлярскага тура (у тым ліку і Булаўскі), в) беларускія і польскія мытнікі, пагранічнікі, г) палякі – пакупнікі на Тамашоўскім рынку, Пан Юзаф – пакупнік Узёнтакавага тавару ў Варшаве, д) прысутныя на пахавальным развітанні з Булаўскім. *Рэтраспекцыйны план*: а) сябры Булаўскага (Саша Кукліч і яго жонка), родныя Марыны (бацькі, брат і сястра) і Уладзіслава (маці), б) калегі па працы Булаўскага.

Характары адных літаратурных герояў, іх адносіны да падзей, што разгортваюцца ў аповесці, раскрываюцца ў асноўным у кантэксце тых эпізодаў, якія выразна прадвызначаюць дзеянні другіх герояў. Дынамізм развіцця сюжэта ўплывае на асаблівасці раскрыцця вобразаў твора: вынікі ўчынкаў літаратурных герояў, падставай для якіх з'яўляецца адпаведная іх жыццёвая пазіцыя, не прымушаюць сябе доўга чакаць. Тут адно ўшчыльную і амаль імгненна счэпліваецца, пераплятаецца з другім. Ствараецца такое ўражанне, што кожны з герояў аказваецца ў "патрэбным" месцы і ў "патрэбны" час, каб выканаць нейкую ўласцівую толькі яму функцыю, якую б другі герой, калі б першага тут не было, не здзейсніў.

Такімі героямі і – адпаведна – іх дзеяннямі з'яўляюцца наступныя. *Марынін брат Іван* – прывёз Булаўскім гэты злашчасны спірт. *Настаўнік хіміі Саша Кукліч* – арганізаваў тур для Уладзіслава. "*Стараста*" ў аўтобусе, а фактычна *арганізатар паездкі Леанід Узёнтак* – калі б на яго месцы аказаўся нехта іншы, усё магло б адбывацца інакш. *Начальнік змены мытнікаў у Брэсце Кастусь* – знарок спланавана стварыў спрыяльныя ўмовы для перасячэння мяжы гандлярамі ў сітуацыі відавочнай анамальнасці фактаў, якія суправаджаюць гэтае перасячэнне. *Андрэй Шых і адвакат Паноў* з іх дзеяннямі – гэта своеасаблівы вынік адпаведнай сатанінскай задумы: менавіта яны падпіхнулі Узёнтака да канчатковага здзяйснення страшнага сатанінскага плану. *Цётка Дуся* – спрыяла праяўленню (хай сабе і вонкаваму) чалавечнасці ў гандляроў. *Пан Юзаф* – яго нез'яўленне на сустрэчу з Узёнтакам дзеля набыцця кантрабанднага тавару справакавала адпаведныя паводзіны "*старасты*". *Уладзіславава вучаніца Ядзя Кажура* – яе спазненне ў аўтобус пасля наведвання музея выклікала ў вадзіцеля Валодзі Адамейкі глыбокае нервовае напружанне, а затым (ужо як вынік) і бунт супраць Узёнтака, а таксама далейшае імклівае развіццё падзей. *Рэкеціры Капыток і Язькоў* – іх рабаўніцтва выклікала бунт аптэкаркі Сіўцовай, вынікі якога затым паспяхова ёю былі выкарыстаны на мытні ў час перасячэння мяжы ўжо ў час вяртання ў Беларусь. *Аптэкарка Сіўцова* – яе ўдалы гандаль лекамі, спроба абараніць найперш сябе перад рэкецірамі і затым тэатралізаваная істэрыка на польскай і беларускай мытні спрыялі хуткаму вяртанню ў Брэст. *Вадзіцель Станіслаў Валевіч* – яго адмаўленне ад уласнай пазіцыі "*мы* [толькі. – А.М.] – *возчыкі*" садзейнічае пакаранню Узёнтака. *Рабочая*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

швейнай фабрыкі Тася – яе дзеянні ў адносінах да жывога і памерлага Уладзіслава, да ацэнкі гэтай трагедыі і ўласнага ўдзелу ў ёй – гэта своеасаблівы маральна накіраваны найперш у сэрца рэцыпіента праменьчык, спроба аўтара паставіць важны ідэйны акцэнт у адносінах да падзей "сатанінскага тура".

Такое размеркаванне рухаючых сіл у мастацкай прасторы аповесці невыпадковае. Яно з'яўляецца вынікам пэўных жыццёвых пазіцый, да якіх (найбольш рэтраспекцыйна) адсылае пісьменнік у адпаведных падзейных сітуацыях. Тут няма нічога выпадковага, як бы гэта ні гучала жорстка ў такім вызначэнні. І ў гэтым праяўляецца майстэрства І. Шамякіна як стваральніка напружанага сюжэта.

"Пісаў аповесць. За паўтара месяца – 100 старонак, – адзначае ў дзённіку пісьменнік. – І ў маладосці не працаваў з такой інтэнсіўнасцю. Захапіў сюжэт. І характары. <...>

Аповесць атрымалася. Пасля некалькіх варыянтаў назвы, якія з'яўляліся ў працэсе напісання, спыніўся на незвычайнай рэкламнай назве – "Сатанінскі тур" [1, с. 435].

У сувязі з такой заўвагай аўтара адносна "рэкламнасці" варта адзначыць, што ў назве аповесці ўтрымліваецца значны ў ідэйных адносінах сэнс. Ён з'яўляецца вынікам рэцэпцыйнага асэнсавання такой назвы ў кантэксце фактуальнасці твора.

У сувязі з прыведзеным вышэй сцверджаннем пра з'яўленне герояў аповесці ў "патрэбным" месцы і ў "патрэбны" час можна адзначыць наступнае: большасці з іх у мастацкай прасторы твора ўжо была прадвызначана свая спецыфічная роля ў падрыхтоўцы да гэтага тура і ў яго здзяйсненні. Прадвызначана кім? Часткова адказ утрымліваецца ў назве аповесці: "Сатанінскі тур", а таксама ў аўтарскай заўвазе ў кантэксце эпізоду, калі вырашалася пытанне, ці вяртацца назад у Віцебск з памерлым Булаўскім, ці ехаць далей, у Полыгчу.

"Даўно вядома: сатанінская прапанова, задума нярэдка штурхае людзей, паміма волі іх, на такое ж сатанінскае здзяйсненне. "Сатана там правит бал". "Ибо не стало праведного, ибо нет верных между сынами человеческими"'" [2, с. 435].

Суаднясенне з'яў грамадскага жыцця 1990-х гадоў, зафіксаваных у дзённіках І. Шамякіна, з фактамі аповесці (безграшоўе, дэфіцыт, выродлівыя формы выжывання ў такіх умовах і інш.), аўтарскімі заўвагамі да знешнасці, учынкаў некаторых герояў (напрыклад, Шыха, Панова і інш.) прыводзяць да наступнай думкі. "Сатанінскі тур" – гэта акт двухпланавага вымярэння. З аднаго боку, ён успрымаецца як існаванне людзей 90-х гадоў XX ст. у Беларусі, якое правакавала на выяўленне не самых лепшых пачуццяў, памкненняў, дзеянняў гэтых людзей. Гэта тур-выпрабаванне ў сацыяльную

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

перспектыўную невядомасць, у час якога кожнаму дадзена не толькі адпаведная роля, але і адпаведная доля актыўнасці, выпрабавання і адказнасці. З другога боку – гэта непасрэдна "турыстычна"-гандлярскі тур, у час якога максімальна праявіліся вынікі не толькі асаблівасцей сацыяльнага існавання яго ўдзельнікаў, а і патэнцыйныя схільнасці ў іх характарах і адносінах да свету. І вось менавіта ў гэтым туры былі сабраны прадстаўнікі тых сацыяльных груп, якія ў паказальнасці іх маральных якасцей на ўзроўні большасці (пераважная частка гандляроў) ці меншасці (Уладзіслаў Булаўскі, вучаніца Ядзя, вадзіцель Валодзя Адамейка) з'явіліся той лакмусавай паперкай, што сведчыла пра патэнцыйныя магчымасці грамадства ў садзейнічанні альбо супрацьстаянні сатанінскай задуме адносна чарговага выпрабавання для народа, у прыватнасці, народа Беларусі.

Асноўнымі асаблівасцямі раскрыцця альбо ў цэлым характараў літаратурных герояў, іх адносін да жыцця, альбо адлюстравання праяў іх характараў у кантэксце прыватных эпізодаў у час тура з'яўляюцца наступныя.

Рэтраспекцыі: сведчанні, успаміны герояў аб іх мінулым жыцці (Уладзіслаў Булаўскі, яго жонка Марына); *непасрэдныя характарыстыкі адных герояў другімі* (брат і сястра Марыны ў адносінах да сям'і Булаўскіх); *аўтарскія заўвагі аб фактах мінулага жыцця ўдзельнікаў тура* (Леаніда Узёнтака, Ядзі Кажуры, Тасі і Марусі, вадзіцелей Станіслава Валевіча і Валодзі Адамейкі, начальніка змены мытнікаў Кастуся); *рэальны план дзеяння: непасрэдныя ацэнкі, характарыстыкі і назіранні літаратурных герояў* – сведчаць пра іх жыццёвую пазіцыю і маральныя прыярытэты (Булаўскі, Марына, Узёнтак, Тася, Адамейка), *выказванні, ацэнкі, разважанні літаратурных герояў* адносна падзей тура – падкрэсліваюць паказальныя іх адносіны да супярэчлівых праяў у трагічным вандроўным суіснаванні (Булаўскі, Марына, Узёнтак, Шых, Паноў, Тася, Валодзя Адамейка, Дуся, аптэкарка Сіўцова, прадстаўніца Узёнтакавай фірмы Ірэна Шостак), *непасрэдна учынкі літаратурных герояў* – найбольш выразна характарызуюць адпаведных дзеючых асоб як здзяйсняльнікаў той ці іншай місіі, ускладзенай на іх у гэтым туры.

Сатанінскую функцыю ў аповесці мэтанакіравана выконвае барадач Паноў. Ён – адзіны, хто мог бы падтрымаць у раптоўных (двойчы) намерах Узёнтака павярнуць аўтобус з мытні назад. Але Паноў не робіць гэтага, а, наадварот, падтрымлівае тайныя намеры старасты групы рухацца наперад. Гэты "*маўклівы барадач цыганскага выгляду*", хоць і не збіраўся гандляваць разам з астатнімі ў Польшчы, меў, аднак, сваю задуму: дабрацца на гэтым аўтобусе да месца, куды яму неабходна было даехаць. Ствараецца такое ўражанне, што сэнсаўтваральная функцыя гэтага літаратурнага героя менавіта ў тым, каб падтрымаць намеры Узёнтака, якія ён нібыта не рашаўся агучыць і здзейсніць. Дарога ж да Тамашава Мазавецкага, куды сагітаваў гандляроў ехаць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паноў, – гэта толькі адзін са сродкаў здзяйснення страшнай сатанінскай задумы. Нездарма, відаць, у кнізе, якую чытаў Паноў, былі "*схемы нейкія*". У дадзеным выпадку яны асацыіруюцца з усё тымі ж сатанінскімі схемамі, на якія ўжо звярталася ўвага вышэй.

Паноў з яго намерамі і ажыццяўленнем іх – дзейсны сродак дасягнення сатанінскай задумы – аказаўся абсалютна прыдатным у "патрэбным" месцы і ў "патрэбны" час. Фінал яго зыходу з падзейнай прасторы твора можна параўнаць з ужо вядомым выслоўем: "Маўр зрабіў сваю справу, Маўр можа адыходзіць".

Булаўскі, яго жонка Марына – гэта не адзіныя прадстаўнікі свайго часу з мастацкай прасторы аповесці, якія не ўпісваюцца ў агульны яго кантэкст. Да іх ліку таксама адносяцца вадзіцелі аўтобуса Станіслаў Валевіч і Валодзя Адамейка, вучаніца Булаўскага Ядзя, гандляркі цётка Дуся і Тася. Названыя літаратурныя героі выконваюць даволі важную сэнсаўтваральную функцыю. Іх учынкі акцэнтуюць увагу на неабходнасці арыентацыі на высокае – духоўнасць, чалавечнасць, гуманнасць, справядлівасць – ва ўмовах, якія, здавалася б, перакрэсліваюць такую неабходнасць. Гэтыя арыентацыі названых вышэй герояў успрымаюцца як своеасаблівая спроба лепшага з жыцця (часам безабароннага, спантаннага, выпадковага) супрацьстаяць страшным сатанінскім намерам.

Асаблівасці мастацкай канстатацыі праблем, іх раскрыцця ў наступным. Спачатку аўтар акрэслівае надзённыя пытанні грамадскага жыцця з дапамогай непасрэднай формы іх адлюстравання: праз выказванні, разважанні літаратурных герояў альбо аўтарскія каментарыі. Затым гэтыя ж самыя праблемы ілюструюцца і развіваюцца ў адпаведным падзейным кантэксце. Звернемся да канстатацыі актуальных пытанняў грамадскага жыцця, адлюстраваных у аповесці, якія ўяўляюць сабой даволі шырокае ў сэнсавых адносінах праблемнае поле.

– *Крушэнне маралі ва ўмовах татальнага спажывецкага дэфіцыту.* Гэтая праблема ў пачатку аповесці акрэсліваецца непасрэдна ў разважаннях Марыны [2, с. 87]. У далейшым яна апасродкавана вымалёўваецца ў кантэксце падзей "сатанінскага тура" як пацвярджэнне Марыніным ацэнкам. Выразна пераклікаецца гэтая праблема таксама з назіраннямі і вывадамі пісьменніка з яго дзённікавых запісаў першай паловы 1990-х гадоў, аб якіх была гутарка вышэй.

– *Імкненне пасрэднасці ўзысці на сацыяльны верх.* Найбольш выразна гэта ілюструецца на прыкладзе вобраза Узёнтака.

– *Прыстасаванне былых і цяперашніх лідэраў да новых умоў жыцця* і адмаўленне пры гэтым ад ідэалаў, якія яны раней прапагандавалі. Выразнае сведчанне таму – вобраз Узёнтака, начальніка змены мытнікаў Кастуся.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– *Вызначэнне вартасці (уяўнай і сапраўднай) чалавека.* Паводле Узёнтака, яна вызначаецца колькасцю торбаў і іх аб'ёмам, паводле Уладзіслава – духоўнасцю, інтэлігентнасцю.

– *Праявы адноснасці маральнага і амаральнага ў сітуацыі маральнага выбару.* Трагічная сітуацыя правакуе праяўленне не самых лепшых пачуццяў, адчуванняў і ўчынкаў чалавека, якія ў не безвыходнай з іх пазіцыі сітуацыі знаходзіліся б альбо на ўзроўні патэнцыйнай зададзенасці, альбо на ўзроўні пратэсту.

– *Праявы адноснасці маральнай адказнасці.* Галоўнае ў сітуацыі адпаведнага жыццёвага выбару для Узёнтака – гэта магчымае асуджэнне людзей за здзейснены ім учынак, а не ўласны маральны імператыў.

– *Праявы салідарнасці ў натоўпе як супрацьпастаўленне вечнай значнасці агульначалавечым каштоўнасцям.* Гэта супакойвае маральных вычварэнняў: "*мы ўсе на адзін капыл*" [2, с. 132].

– *Схільнасць натоўпу даваць нагоду для суб'ектыўнага яго ўспрымання як "быдла".* Улагодзіш натоўп – атрымаеш жаданы ўчынак, падтрымку для сябе.

– *Схільнасць да здрады сваіх (хаўруснікаў) сярод сваіх.* Пасля таго як і Гвоздзік, пасланы з папярэджаннем да Дзіяны, не вярнуўся да групы, Узёнтак робіць наступны вывад: "Усе здраднікі! Усе! Вялікія і малыя, палітыкі і спекулянты, генералы і прастытуткі. <…>" [2, с. 133].

– *Імкненне ва ўмовах дэфіцыту да здзяйснення бізнесу любым шляхам.* Маральнае злачынства, якое мяжуе з крымінальным, успрымаецца як неабходная норма.

– *Здзяйсненне побытавых маральных ацэнак з пазіцыі двайных стандартаў ва ўмовах натоўпавай салідарнасці.* Такія ацэнкі залежаць ад таго, у якой ступені яны адпавядаюць побытавым прыярытэтам тых, хто іх робіць.

– *Свядомы і несвядомы зварот да Бога ў трагічнай сітуацыі як спроба аберагчы сябе і іншых ад яшчэ большай бяды ў сітуацыі, калі адсутнічае надзея на дапамогу ад людзей.* Так, напрыклад, цётка Дуся чытае псалмы і малітвы не толькі дзеля ўшанавання памяці Булаўскага, але і з мэтай выклікання спагады і міласці з боку Стваральніка да грэшнікаў з аўтобуса. Назіраем таксама побытавы (мімаходзь) зварот да Бога старшага вадзіцеля Валевіча пасля таго, як Валодзя размалаціў твар Узёнтаку і зламаў руку Юрыку, а сам разам з Ядзяй пакінуў аўтобус.

– *Імкненне да выратавання праз розныя па сваёй сутнасці ўчынкі: пратэст, пакаянне, пакаяннае змірэнне.* Яно назіраецца ў паводзінах вадзіцелей Валодзі Адамейкі (пратэст супраць Узёнтака, спроба праз адыход з Ядзяй выратаваць у асобе гэтай дзяўчынкі прыгожае) і Станіслава Валевіча (рашучы яго ўчынак каля міліцыі ў Брэсце), а таксама (асабліва) у пазіцыі Тасі ў час паездкі і пасля яе: на пахавальным развітанні з Булаўскім.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Спрыяючы канчатковаму развіццю сатанінскай задумы, героі аповесці садзейнічаюць не толькі здзяйсненню канчатковых – трагічных – эпізодаў у жыцці Булаўскага, але і ў лёсе іншых людзей (у тым ліку і ўласным): у жыцці жонкі і дачкі галоўнага героя, у лёсе кіраўніка тура Узёнтака, гандляркі Тасі, гіпатэтычна – у лёсе вучаніцы Булаўскага Ядзі, вадзіцеля аўтобуса Валодзі і інш.

Амаль кожны з герояў аповесці сваімі ўчынкамі ўскосна спрыяе набліжэнню апошніх гадзін у жыцці Уладзіслава Булаўскага, апошніх дзён існавання яго (ужо нежывога) у такім няўтульным свеце. Гэта і маці галоўнага героя, якая не перашкаджала сыну хаваць яго смяртэльную хваробу, і жонка, якая не заўважала відавочных праяў пароку сэрца ў мужа, і калегі па працы, якія таксама не надавалі належнай увагі паказальным праявам хваробы Булаўскага – усё гэта факты рэтраспекцыйнага плану. У рэальным жа часе лёс Уладзіслава вырашаецца збегам абставін, калі галоўнаму герою і яго сям'і невыносна цяжка выжываць ва ўмовах безграшоўя, спажывецкага і маральнага дэфіцыту. Вызначальную ролю тут выконваюць учынкі блізкіх Уладзіславу людзей. Брат яго жонкі прывозіць спірт для продажу, сябар сям'і дапамагае зрабіць з гэтага спірту гарэлку ўсё для таго ж продажу. Гандляры з аўтобуса ўгаворваюць Уладзіслава ўсё ж ехаць на гандаль, калі той, адчуўшы боль у сэрцы, вырашае спыніць сваю паездку, сышоўшы з аўтобуса ў Мінску. Уладзіслава жонка, прадчуваючы бяду, спрабуе дагнаць на таксі аўтобус, каб адгаварыць мужа не ехаць у Польшчу, але ў яе не атрымліваецца гэта зрабіць. Не ўдаецца Марыне, бо супакоілася пасля размовы з сястрой па тэлефоне, рэалізаваць свой намер спыніць мужа з дапамогай брата Івана, які б пераняў аўтобус у Лепелі і прапанаваў "*Уладзіку высадзіцца*" [2, с. 114].

І. Шамякін не акрэслівае абставіны аднаго з першых актаў сатанінскай задумы ў адносінах да падзейнай сітуацыі з аповесці: нараджэння Уладзіслава. У гэтым творы падрабязна адлюстроўваецца здзяйсненне фінальных акордаў такой задумы. Але калі ўжо для непасрэднага ўдзелу ў яе выкананні быў абраны менавіта Булаўскі, то, відаць, невыпадковым з'яўляецца той факт, што ён прыйшоў у гэты свет з ужо своеасаблівым трагічным знакам: прыроджаным парокам сэрца. Гэтая хвароба ў сукупнасці з пэўнымі абставінамі паступова падводзіла Уладзіслава да трагічнага фіналу яго жыцця. Сітуацыя, у якой аказваецца галоўны герой аповесці пры яго жыцці (безграшоўе), і яго цела пасля смерці (вандраванне з гандлярамі) сведчыць аб тым, што нездарма для здзяйснення такой трагічнай задумы быў абраны менавіта Булаўскі. Лепшыя людзі, якія сваёй маральнай пазіцыяй у жыцці маглі б супрацьстаяць горшым, адыходзяць у нябыт, пакідаючы жыццёвую прастору для дзеяння гэтым горшым. Пакаранне Узёнтака ў аповесці яшчэ не азначае перамогу над злом. Тася, для якой Булаўскі з'явіўся праменем чысціні ў гэтым злыбедным свеце, у фінале аповесці збіраецца ісці ў манастыр, аднак пры гэтым яна сутыкаецца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

са зларадствам з боку Марусі. Працэс маральнага супрацьстаяння працягваецца. Нездарма аповесць заканчваецца наступнымі радкамі.

"*Пайшоў ціхі, лёгкі снег. І ён звінеў – у Тасі ў вушах, у сэрцы. Здалося ёй, што гэта неба іграе жалобу па ўсіх людзях, бо надыходзіць канец свету*" [2, с. 158].

І вось гэтая прыватная падзейная сітуацыя з аповесці ўяўляе сабой толькі адну з гісторый у агульнай сатанінскай задуме выпрабаванняў для людзей, якія – выпрабаванні – будуць спрыяць праяўленню не самых лепшых адчуванняў, памкненняў, учынкаў людзей, што могуць прывесці да канца свету.

Ахарактарызаваныя тут асаблівасці аповесці даюць падставу для правядзення яшчэ адной паралелі з дзённікавымі запісамі пісьменніка, да якіх звярталіся вышэй, – паралелі на прадмет супадзення фактаў прататыпнай рэчаіснасці і фактаў мастацкай прасторы твора. Да якіх вывадаў прыводзіць такое супастаўленне?

Мастацкая прастора аповесці – з аднаго боку – гэта своеасаблівае люстэрка не толькі эпізодаў прыватнага жыцця прадстаўнікоў большасці і меншасці з сацыяльнага асяроддзя першай паловы 1990-х гадоў, а і эпізодаў, фактаў прыватнага жыцця пісьменніка і яго сям'і. З другога боку – у аповесць перанесены (у той ці іншай форме гэтай трансфармацыі) вывады і назіранні І. Шамякіна, якія пульсавалі ў яго свядомасці ў час напісання твора. Нічога дзіўнага ў такой трансфармацыі няма – гэта адна з асаблівасцей стварэння мастацкага тэксту. Аднак у той жа час такая асаблівасць з'яўляецца і паказальнай. Паказальныя болевыя кропкі рэчаіснасці, якія выразна раскрываюць яе сутнасць, пісьменнік пераносіць у твор не механічна, а ў адпаведнасці са спосабам, што дазваляе ствараць пераканальную карціну грамадскіх супярэчнасцей у кантэксце лёсу канкрэтных людзей. У сувязі з адзначаным звернемся да прыкладаў.

І. Шамякін характарызуе Уладзіслава Булаўскага як "*талстоўца*". У дзённікавых запісах пісьменніка чытаем: "*Прагна пісаў* ["Сатанінскі тур". – А.М.], *спяшаўся, як баяўся, што не хопіць часу. Увогуле, прагна жыву. <...> Прагна общаюсь з людзьмі. І люблю іх, людзей. Нават ворагаў сваіх. Талстовец <...>*" [1, с. 435]. І. Шамякін надзяляе Булаўскага (літаратурны герой, як і аўтар, аказаўся разгубленым у сітуацыі, якая вымагала сацыяльнага прыстасавання ва ўмовах выжывання) рысамі характару, уласцівымі яму самому. Такое супадзенне назіраецца не толькі ў гэтым эпізодзе, а і ў іншых (з жыцця сям'і Булаўскіх), калі іх параўнаць з фактамі безграшоўя, нястачы, побытавага дыскамфорту перыяду 1990-х гадоў і адносін да ўсяго гэтага ў сям'і самога пісьменніка, на якія ён звяртае ўвагу [1, с. 365, 379, 401, 408, 415, 431] у сваіх дзённікавых запісах. Такія супадзенні з фактамі прыватнага жыцця пісьменніка і яго героя дапаўняюцца іншымі супадзеннямі мастацкай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

фактуальнасці твора і прататыпнай прасторы, ва ўмовах якой ён узнік: вывад Івана аб тым, "*як хапаюць*" (крадуць) у цяперашнім жыцці // вывад пісьменніка "*Жах! Грабяць усе, хто можа*"; "*Усе крадуць. Жах!*" [1, с. 362, 443]; злачынная пазіцыя Узёнтака і адпаведныя яго паводзіны – у аповесці // вывад пісьменніка аб "злачынным" нараджэнні "*трэцяга саслоўя*"; "*Большасць мільянераў можна сёння саджаць на лаўку падсудных*" [1, с. 395]; злачыннае выкарыстанне свайго службовага становішча Кастусём – начальнікам змены мытнікаў // вывад пісьменніка аб "*адкрытым, бесцырымонным*" хабарніцтве "*90 працэнтаў чыноўнікаў*" [1, с. 402]; імкненне большасці герояў аповесці здабыць грошы ва ўмовах сацыяльнага выжывання і страта імі пры гэтым чалавечага аблічча // "*пагоня за грашамі, за доларамі*" ў грамадстве, калі ў "*думках не застаецца нічога святога*" [1, с. 434]; выпіўкі "турыстаў" у аўтобусе з мёртвым Булаўскім // "*грандыёзная п'янка*", наладжаная спонсарам царквы – фірмай "Хелена Валеры" – у Палацы піянераў на Вялікдзень. Гэта толькі тыя фактуальныя супадзенні, якія адносяцца да часу напісання аповесці "Сатанінскі тур".

Такім чынам, аповесць І. Шамякіна "Сатанінскі тур" – гэта мастацкі паказ не толькі аднаго прыватнага трагічнага факта, які меў месца ў прататыпнай рэчаіснасці. Гэта сфакусаваны погляд аўтара на вынікі сацыяльнага бязладдзя ў іх татальных уплывах на лёсы людзей.

Акрамя таго, рэцэпцыйнае асэнсаванне фактаў аповесці падводзіць да высновы аб існаванні ў экзістэнцыйнай прасторы варожых чалавеку сіл, якія спрыяюць праяўленню дзеля дасягнення сваіх страшных планаў горшых – патэнцыйна закладзеных у чалавеку – яго схільнасцей і выхаду на першы план горшых абставін у лёсе чалавека. А лепшыя сілы з экзістэнцыйнай прасторы пры гэтым адступаюцца ад чалавека: няхай робіць, што яму жадаецца. Прыгадаем у сувязі з гэтым, што "*месячык і планета смяяліся*" [1, с. 122] з тых, хто вырашаў, што рабіць з целам памерлага Булаўскага, а таксама той факт, што Узёнтак пасля ўдалага для яго рашэння мужчын з групы ехаць далей, у Польшчу, "*паказаў кукіш месячыку і планеце*" [1, с. 123].

У той жа час палярызацыя маральных сіл у аповесці прыводзіць да наступнай высновы: маральнае супрацьстаянне ў грамадстве ўсё ж можа мець пазітыўныя вынікі. І ў гэтых адносінах маральнае выпрабаванне для чалавека не праходзіць безвынікова.

Літаратура:

1. *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне: Дзённікі 1980–1995 гадоў / І. Шамякін. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 362–516.
2. *Шамякін, І.* Сатанінскі тур: Аповесці / І. Шамякін. – Мінск: Маст. літ., 1995. – С. 83–159.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова